**Моднікава В. М.**

# АКМЕЯЛАГІЧНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ ПРАФЕСАРА А.С. ЗУБРА

Прафесар культуралогіі Аляксей Сцяпанавіч Зубра скончыў Барысаўскую сельскагаспадарчую школу, Хабараўскае артылерыйскае вучылішча, Цэнтральныя артылерыйскія афіцэрскія курсы (г. Ленінград). Ваенную акадэмію (г. Масква), аспірантура Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Т. Шаўчэнкі.

Акадэмік акмеялогіі Зубра Аляксей Сцяпанавіч у мінулым намеснік кіраўніка Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча, дацэнт кафедры філасофіі Мінскага інстытута культуры, загадчык кафедры менеджмэнта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры; прафесар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі.

Асноўны напрамак навуковай дзейнасці прафесара А.С. Зубра – праблемы фарміравання культуры асобы, культура сучаснага кіраўніцтва.

За свае жыццё Аляксей Сцяпанавіч Зубра паспрабаваў сабе ў 13 прафесіях: ад трактарыста да вядомага ў краіне вучонага. Працаваў таксама ў якасці дырэктара Дома культуры ў вёсцы Зэмбін Барысаўскага раёна, шмат часу правёў у армейскай службе, скончыў ваенную акадэмію. Калі выйшаў на адпачынак, пачаў займацца навукай. Сёння Аляксей Зубра – акадэмік акмеялогіі, акадэмік Сусветнай акдэміі тэхнічнай адукацыі, прафесар культуралогіі, доктар педагагічных навук, кандыдат філасоўскіх навук. Аўтар вялікай колькасці кніг, сярод якіх "Учись учиться", "Культура умственного труда старшеклассников", "Культура личности как духовная ценность", "Акмеология – ключи к успеху", "Искусство обращения с людьми: управленческая этика", "Самосовершенствование – путь к успеху", "Ораторское искусство – путь к успеху", "Этика и этикет государственной службы", "Культура умственного труда студента", "Ораторское искусство руководителя", "Искусство обращения с людьми. Упраленческая этика" и др., таксама яго кнігі можна паслухаць на CD-дысках [1].

Акмеялогія – (ад старажытна-грэчаскай мовы akme – вяршыня, ст.-грэч.logos – вучэнне) – напрамак псіхалогіі, які даследуе законы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

механізмы, што забяспечвае магчымасць дасягнення вышэйшай прыступкі (акмэ) індывідуальнага развіцця. На Беларусі акмеялогія развіваецца ў межах навукі псіхалогіі. У якасці ўласнай галіны прадугледжана ва ўніверсітэце імя Я. Купалы, што ў Гародні, але, на жаль, толькі для аспірантаў. У іншых установах вышэйшай адукацыі вывучаецца, як адганалінаванне псіхалогіі. Пашпарт спецыяльнасці зарэгістраваны у ВАКу прыказам № 232 ад 11 снежня 2006 г. Такім чынам, магчыма зрабіць вынік аб тым, што акмеялогія ў Беларусі маладая, развіваючаяся і перспектыўная навука. Прафесар А.С. Зубра ў сваёй канцэпцыі прапаноўвае метадалогію жыцця - акмеялогію, тое, што аб’ядноўвае ўсе формы жыцця. "И бесполезно обвинять друг друга: не та семья, школа виновата, улицы не те, СМИ не о том пишут… Просто нужно увлечь каждого человека лучшими идеалами, незыблемыми духовными ценностями" [2, с 5].

У акмеялогіі аб’ектам назірання з’яўляецца сам чалавек. Я – грамадзянін, я – прафесіянал, я - бытавы чалавек, я – сын, я – бацька. Мая асоба ёсць пастаянны аб’ект назірання, майго асабістага аналізу. Я асоба, якая жыве сваім асабістым жыццём, я – прафесіянал, які гэтага чалавека вывучае.

Прафесар Зубра А.С. разглядае чалавека ў акмеялогіі як непадзельную агульнасць фізічнага, псіхічнага, маральнага, эстэтычнага, інтэлектуальнага, прафесійнага. Чалавек неад’емная частка Сусвету, Прыроды. Таму калі будаваць сваё жыццё, як патрэбу мець матэрыяльнае, незважаючы на навакольнае асяроддзе, гэта можа прывесці да страты людзей. Час ад часу на Зямлі гінуць чалавечыя цывілізацыі. Але, пачынаючы, новы віток жыцця, людзі робяць тыя ж памылкі. Яшчэ Фукідзід у V ст. да н.э. адзначаў, што людзі пачалі развівацца з мэтай мець матэрыяльнае і захоўваць яго.

Па меркаванню прафесара А.С. Зубра, чалавек створаны, каб існаваць у трох мірах: ментальным, астральным, фізічным, гэта значыць у мірах мыслення, пачуцця і дзеяння. Той, хто адмаўляе хаця б адзін з гэтых кірункаў, страчвае сваю уласную каштоўнасць, не можа развіваць сваю ўласную годнасць і здольнасці. Болей таго, трэба ведаць, калі не звяртаеш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

увагі на адзін кірунак, то будзе сапсавана якасць двух астатніх. Калі адмаўляешся працаваць у фізічным плане, то сустрэнеш прыпыненне ў дзейнасці эмацыянальнай і інтэлектуальнай сфер.

Пазнаёміўшыся з дзейнасцю прафесара А.С. Зубра, усведамляеш, што яго кнігі дапамагаюць лепей зразумець чалавека, гэта значыць самога сабе, а таксама стымулююць выпрацоўку навыкаў вядзення дзелавых бясед; змяшчаюць саветы аб тым, як настаўніку кіраваць студэнтамі; спрыяюць павышэнню ўзроўня культуры асобы.

Жыццё – самая вялікая і галоўная каштоўнасць, якая ёсць у чалавека. А.С. Зубра ў кнізе "Самосовершенствование – путь к успеху" дапамагае выпрацоўцы станоўчага ўспрыняцця свайго асабістага “Я”, вучыць, як забяспечыць сабе такую якасць здароўя, каб весці той лад жыцця, да якога чалавек імкнецца і цяпер і ў будучыні, прафесар распавядае, як паспяхова кіраваць сабою, быць шчаслівым і працаваць на карысць не толькі ўласную, але і усяго грамадства.

Усялякая згода і гарманічны лад паміж думкамі, пачуццямі і дзеяннямі ёсць музыка. Таму каштоўным у самаўдасканальванні з’яўляецца фарміраванне высокага духу асобы, чалавека высокай маральнай годнасці і памкненняў з пазіцыі “Я – канцэпцыя”. Тут дух з’яўляецца любоўю да якасці, а воля імпэт да самаўдасканалення ва ўсіх сферах жыцця. Неабходна выпраўляць сваё жыццё ўвогуле, таму што любая сістэма пачынаецца з мэты. Чалавек павінен выкарыстоўваць матэрыяльнае для стварэння найлепшых умоў для развіцця духоўнага патэнцыялу асобы [3, с. 3].

Дзейнасць прафесара А.С. Зубра засяроджвае на сабе ўвагу, вызывае павагу, патрабуе азнаямлення, прачытання кніг і артыкулаў гэтага аўтара, а таксама папулярызацыі і прапаганды яго прац па акмеялогіі, аратарскаму майстэрству, самаўдасканальванню асобы, педагагічнай, культуралагічнай і іншых відаў і родаў яго дзейнасці. А пра гэтага цудоўнага карыснага чалавека няма, нават, і старонкі ў Вікіпедыі!

Зубра Аляксей Сцяпанавіч чытае па 12 гадзін лецый, без паперкі, з тэмпераментам Высоцкага. “Цікава, занімальна, карысна” – гэта водгук

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працоўнікаў пяра аб мінулых занятках. Сам прафесар лічыць сябе амаль шчаслівым чалавекам, па-першае, таму, што запатрабаваны часам, а па-другое, за тое, што займаецца любімай справай, а яму за гэта яшчэ і грошы плацяць [4].

---

1. Аляксей Сцяпанавіч Зубра [Электронны рэсурс]. – Рэжым дасягнення : http:// www.ozon. ru. – Дата доступа : 08.01.2013.

2. Зубра, А.С. Акмеология – ключи к Успеху / А.С. Зубра– Мн. : Дикта, 2011 – 196 с.

3. Зубра, А.С. Самосовершенствование – путь к Успеху! / А.С. Зубра. – Мн. : Дикта, 2011 – 332 с.

4. Зубра Аляксей Сцяпанавіч [Электронны рэсурс]. – Рэжым дасягнення : http:// www.pac.by/ru/general-information /. – Дата доступа : 08.01.2013.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ